Своеобразием образовательно-воспитательной системы как духовного и социального феномена является эффект «присутствия»: ее прошлая история не уходит «в никуда», она продолжает жить в новой эпохе в виде достижений культуры, формах сознания людей, в виде осуществленного выбора, в морально-этических нормах и правилах практического поведения. И с этой позиции история Германии XIX – XX веков актуальна для научного исследования.

1. Очерки истории школы и педагогики за рубежом (1917-1939). М., 1982. С.5.
2. Новая история стран Европы и Америки / под ред. А. В. Адо. М., 1985. С. 429.
3.Джуринский А. Н. История педагогики М., 1999. С. 261.

## БЕЛАРУСКА - ЎСХОДНЕНЯМЕЦКІЯ НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ (1965-1990 гг)

Лебедзь М.І.
*г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

Перш чым звярнуцца да беларуска-ўсходненямецкіх навуковых сувязяў гэтага часу, хацелася б звярнуць увагу на тое, што пранікненне беларускай навукі ў ГДР адбывалася ў якасці аднаго з элементаў савецкай навукі.

З 1965 года па 1990 год склаліся характэрныя для таго перыяду формы беларуска-ўсходненямецкіх навуковых сувязяў. На працягу гэтага часу паступова павялічваўся навуковы абмен. Быў арганізаваны штогадовы абмен студэнцкімі групамі паміж факультэтамі нямецкай мовы Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў і інстытутам перакладчыкаў з горада Лейпцыга. Падтрымліваліся сувязі паміж Мінскім інстытутам народнай гаспадаркі і універсітэтам імя К.Маркса з горада Лейпцыга. Навуковыя сувязі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў з БССР і ГДР здзяйсняліся шляхам абмену групамі студэнтаў для праходжання практыкі, правядзення сумесных вечароў, канферэнцый і іншых мерапрыемстваў.

Апроч практыкі, студэнты накіроўваліся і на вучобу. Некалькі прадстаўнікоў хімічнага і фізічнага факультэтаў БДУ праходзілі курс навучання па трохгадовай праграме, а 2 студэнты Беларускага палітэхнічнага інстытута навучаліся па пяцігадовай праграме[1].

У 1968 г. абмен студэнтамі праводзіўся паміж наступнымі навучальнымі ўстановамі: БДУ (БССР) і Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера (ГДР), БДУ і Гальскім універсітэтам імя М. Лютэра (ГДР), Белсельгасакадэміяй (БССР) і Універсітэтам імя Карла Маркса (Лейпцыг, ГДР), Мінскім педінстытутам замежных моў (БССР) і Універсітэтам імя Карла Маркса, Мінскім педінстытутам імя М.Горкага і педінстытутам горада Кетэн[2]. "Група студэнтаў-хімікаў БДУ у Іенскім універсітэце мела магчымасць азнаёміцца з навуковай працай інстытутаў неарганічнай, арганічнай і фізічнай хіміі і хіміі шкла. Студэнты засвоілі методыку рэнтгенаструктурнага аналіза монакрысталаў і выкарыстання ЭВМ для разлікаў рэнтгенаграм.

Аднак слаба выкарыстоўвалася форма абмену, якая давала магчымасць вывучаць арганізацыю навукі, методыкі выкладання, навучальнага працэсу, навуковых даследаванняў у краінах сацлагеру, адной з якіх з'яўлялася ГДР[3].

У кастрычніку 1967 г. паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. Леніна і Універсітэтам імя Ф. Шылера ў Іене была падпісана дамова пра навуковыя кантакты, культурнае і сяброўскае супрацоўніцтва. Сярод формаў супрацоўніцтва былі ўзаемаабмен навукоўцамі, аспірантамі і студэнтамі для чытання лекцый і правядзення навуковай працы, для падрыхтоўкі дысертацый і навучання, для азнаямляльна-вытворчай практыкі[4]. У 1971-1972 гг. быў выдадзены на нямецкай і расійскай мовах зборнік артыкулаў пад назвай "Супраць буржуазнай і рэфармісцкай ідэалогіі", падрыхтаваны вучонымі БДУ і Іенскага універсітэта пад рэдакцыяй прафесара У. Сікорскага і Д. Фрыке. У гэтым выданні выразна адлюстроўваецца прапагандысцкі накірунак ва ўсіх 11 артыкулах. Пераважная большасць з іх – 8 – прысвечана крытыцы, пераважна несправядлівай, заходненямецкіх ідэёлагаў, палітолагаў і філосафаў. Сярод аўтараў – М. Вайсбэкэр, Х. Братэр, Г. Унбэгау, В. Фрыч, А. Міхайлаў, М. Елісееў і іншыя вучоныя.

У 1979 г. у Іенскім універсітэце адбыўся калёквіум, прысвечаны 30-й гадавіне ўтварэння ГДР і 12-годдзю падпісання дамовы, у якім прынялі ўдзел беларускія вучоныя з Мінска і нямецкія вучоныя з Берліна, Лейпцыга, Іены, Гале, Патсдама і Эрфурта. Даклады калёквіума не адлюстроўвалі рэальнага стану рэчаў, бо ў большасці выпадкаў

аднабакова паказвалі гісторыю БССР як гісторыю камуністычнай партыі БССР і СССР. Гэта асабліва тычыцца прамоў беларускіх вучоных М. Баранавай "Здзяйсненне ленінскай нацыянальнай палітыкі падчас дзяржаўнага будаўніцтва БССР" і Н. Паўлавай "Эканамічны ўздым Савецкай Беларусі ў перыяд развітога сацыялістычнага грамадства". З нямецкага боку былі даклады, якія заслугоўвалі ўвагі фактычным матэрыялам і жаданнем спасцігнуць рэальныя гістарычныя працэсы. Можна адзначыць даклады К. Рэмера "Беларусь у планах нямецкага імперыялізму", Х. Гірца "Ваенная і ваенна-палітычная сітуацыя на Беларусі ў 1916/17 гг.", Г. Лаўэнрота "Утварэнне савецкай улады ў Беларусі (сакавік 1917 – студзень 1918)" і Г. Хёнэ "Беларускае пытанне ў 1918/19 гадах". Хоць яны асветлены таксама даволі аднабакова, але ўжо пастаноўка пытання і зварот да праблем ўтварэння БНР мелі пэўнае пазітыўнае рашэнне ўключэннем фактаў і падзей, якія ў БССР замоўчваліся. Паводле дакладаў на гэтым калёквіуме быў выдадзены зборнік[5].

У ГДР час ад часу з'яўляліся даследаванні па праблемах старажытнай беларускай мовы. У 1974 г. пабачыў свет артыкул Е. Дзіцэ "Скарочаны і перапрацаваны варыянт граматыкі М. Сматрыцкага 1638 г."[6]

У 1970-я гады 12 навуковых устаноў БССР супрацоўнічалі з 14 навуковымі ўстановамі ГДР. Асноўная вобласць супрацоўніцтва – фізіка, матэматыка, электроніка. Інстытут тэхнічнай кібернэтыкі АН БССР супрацоўнічаў з даследчым цэнтрам народнага прадпрыемства "Карл-Цайс-Іена", Інстытут цепла -і масаабмена АН БССР з Інстытутам механікі АН ГДР, Беларускі НДІ земляробства – з НДІ селекцыі раслін у г. Гюльцове, Беларускі НДІ жывёлаводства – з НДІ у Думерсдорфе[7].

12 студзеня 1973 г. Акадэмія сельскагаспадарчых навук ГДР прысудзіла акадэміку Усесаюзнай ордэна Леніна Акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У. Леніна, акадэміку АН БССР С. Скорапанаву медаль імя Э. Баўра за навуковыя дасягненні ў вобласці меліярацыі і выкарыстанні тарфяных глеб, за асаблівыя заслугі ў арганізацыі і кіраўніцтве сельскагаспадарчай навукай і развіццё супрацоўніцтва паміж СССР і ГДР[8].

У міжнародных сувязях акадэмій навук важнейшымі напрамкамі былі абмен інфармацыяй, узаемавывучэнне вынікаў даследаванняў, дамовы пра двухбаковае і шматбаковае супрацоўніцтва, дапамога ў падрыхтоўцы спецыялістаў. У 1973 г. прадстаўнікамі АН сацыялістычных краін, у тым ліку БССР і ГДР было падпісана пагадненне аб заснаванні ў Мінску міжнароднага цэнтра для павышэння кваліфікацыі навуковых кадраў па праблеме "Цепла- і масаабмена". Кантакты з калегамі ў ГДР меў Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Спецыялісты Інстытута тэхнічнай кібернетыкі з нямецкімі вучонымі стварылі праграмы аўтаматызаванага праектавання шэрагу тэхналагічных працэсаў. Вучоныя Інстытута біяарганічнай хіміі з Цэнтральнага інстытута малекулярнай біялогіі распрацавалі арыгінальныя метады сінтэзу высокаэфектыўных тэрмінатараў біясінтэзу ДНК. Вучоныя ГДР стварылі ўнікальныя лазерныя спектрометры і пазней частку перадалі ў СССР. 80 дыэлектрычных люстраў да іх вырабілі супрацоўнікі Інстытута фізікі АН БССР і перадалі ГДР[9]. У БССР былі зроблены для Усходняй Германіі таксама 30 лазераў "Аметыст"[10].

У праграму сумеснага навуковага пошуку паміж АН ГДР і АН БССР увайшлі даследаванні ў галіне матэрыялазнаўства для патрэб ядзернай энергетыкі, таксама сумесныя намаганні па вывучэнню сейсмічнасці, выкліканай горнымі прамысловымі аб'ектамі, аналіз глыбінных разломаў зямной кары. Было вырашана каардынаваць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў імуналогіі, мікрабіялогіі, цепла- і масаабмене. У перспектыве планавалася супрацоўніцтва вучоных-грамадазнаўцаў. У выніку была атрымана магчымасць аператыўнага вырашэння навуковых праблем, дзякуючы падзелу працы, змяншэнню кошту даследаванняў, хутчэйшаму ўкараненню вынікаў даследаванняў у практыку.

У 1970-1980-я гг. развіваліся сувязі паміж навукова-даследчымі інстытутамі і творчымі арганізацыямі, напрыклад, Інстытутам тэхнічнай кібернетыкі АН БССР і Даследчым цэнтрам народнага прадпрыемства "Карл-Цайс-Іена"[11].

У 80-я гады ў ГДР зацікаўленыя навукоўцы падключыліся да даследавання беларускай літаратуры. На славіністычных факультэтах універсітэтаў былі выкананы курсавыя працы (Г. Чапега, Г. Шварц і інш.), напісаны кандыдацкія дысертацыі. У прыватнасці, у Дрэздэнскім педінстытуце ў 1986 г. Д. Шпрынгман абараніла дысертацыю "Творчыя прынцыпы Алеся Адамовіча ў сувязі з ідэйна-мастацкай

эвалюцыяй яго твораў пра Вялікую Айчынную вайну", якая з'яўляецца добрым укладам у літаратуразнаўства ГДР у распрацоўцы беларускай тэматыкі.

Сваё адлюстраванне ў навуцы знайшлі беларуска-нямецкія культурныя сувязі. Імі заняўся ў 1973-1976 гг. супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР У. Сакалоўскі. У 1977 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму: "Беларуска-нямецкія літаратурныя сувязі перыяду Веймарскай рэспублікі". У 1984-1987 гг. гэты беларускі даследчык у Інстытуце літаратуры выконваў планавую навуковую тэму "Інтэрпрэтацыя і ўспрыняцце беларускай літаратуры ў ГДР", пасля чаго ў 1988 г. выдаў манаграфію "Беларуская літаратура ў ГДР" і нарыс у саўтарстве з Г. Адамовіч, Л. Казыром і І. Чаротам "Беларуская савецкая літаратура за мяжой". У сваёй манаграфіі У. Сакалоўскі разглядзеў упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве пытанні распаўсюджвання беларускай літаратуры ў ГДР. Гэты беларускі вучоны па праблематыцы беларуска-ўсходненямецкіх культурных сувязяў зрабіў шэраг публікацый у друку[12].

На дадзеным этапе паміж ГДР і БССР адбылося пашырэнне навуковых сувязяў. Нягледзячы на тое, што гэтаму перашкаджала некалькі акалічнасцяў: амаль увесь працэс з самага пачатку набыў ідэалагічна-фармальны і ў многіх выпадках чыста прапагандысцкі характар. І толькі ў другой палове 80-х гадоў, калі была дадзена некаторая ініцыятыва паасобным навукоўцам і кантактам паміж імі, справа набыла больш рэальны характар. Апроч таго, планавы характар сувязяў не даваў пажаданых вынікаў, не дазваляў вольнаму і аб'ектыўнаму развіццю кантактаў паміж навукоўцамі, асабліва ў гуманітарнай сферы.


[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 265. Воп. 11. Спр. 492. Арк. 17.
[2] НАРБ. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 1447. Арк. 5.
[3] НАРБ. Ф. 1220. Воп. 1. Спр. 1665. Арк. 9-10.
[4] НАРБ. Ф. 914. Воп. 4. Спр. 318. Арк. 91.
[5] Zur Geschichte der BSSR und der deutsch-belorussischen Beziehungen. Kolloquium der Sektion Geschichte 30. und 31. Oktober 1979. Wiss. Bearbeitung Dr. Claus Remer. Jena, Friedrich-Schiller Universität, 1981.
[6] Dietze J. Eine gekürzte und bearbeitete Fassung der Grammatik von Smotrickij aus dem Jahre 1638 // Zeitschrift für Slawistik. 1974. Bd. 19. H. 3. S. 364-376.
[7] Архіў Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Воп. 1. Спр. 868 (том 2). Арк. 68.
[8] НАРБ. Ф. 914. Воп. 4. Спр. 485. Арк. 27.
[9] Голас Радзімы. 1987. 5 лютага. С. 3.
[10] Голас Радзімы. 1990. 29 сакавіка. С. 2.
[11] НАРБ. Ф. 914. Воп. 4. Спр. 481. Арк. 10.
[12] Сакалоўскі У. Л. Беларускае апавяданне на нямецкай мове // Полымя. 1972. № 3. С. 239-242; Літаратура і мастацтва. 1973. 16 лістапада; Літаратура і мастацтва. 1983. 30 верасня; Літаратура і мастацтва. 1989. 24 лістапада.


## ПРАВОВОЙ МЕХАНИЗМ БЕЛОРУССКО-ГЕРМАНСКОГО ЭКОНОМИЧЕСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА


Л.Н.Седель

*г. Брест, БКИУ*


«Интерес к Беларуси нужно понимать как интерес, связанный с будущим» - сказал, отвечая на вопросы «Белорусской газеты» в марте 1997 г., управляющий Промышленно-торговой палаты Бонна господин Герт Х. Ульрух.

Сложившаяся к тому времени политическая и экономическая ситуация в республике снизила заинтересованность немецкой стороны в дальнейшем экономическом сотрудничестве. В конце 1996 года изменилось международное положение Республики Беларусь. Не признав результаты ноябрьского референдума, страны Европейского союза ограничили политическое и экономическое сотрудничество с республикой.

И сегодня, спустя семь лет после пятилетнего плодотворного двустороннего сотрудничества, необходимо вспомнить о его результатах, так как они имеют важное значение для дальнейшего развития наших отношений.